Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

1 верасня 2016 года, № 11 (2158)

АКТУАЛЬНА

## У БДУ паступіла больш абітурыентаў

Ва ўніверсітэце падведзены агульныя вынікі залічэння абітурыентаў. Сёлетняя прыёмная кампанія мае некалькі асаблівасцяў.

***Па-першае,*** на працягу апошніх трох гадоў адзначана станоўчая дынаміка па некалькіх паказчыках. У 2016 годзе павялічана колькасць прынятых абітурыентаў. На ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі залічана **5509** абітурыентаў. У 2015 г. – 5287, а ў 2014 – 5085 чалавек. Пры гэтым дадзеная дынаміка захоўваецца па ўсіх формах навучання.

На дзённую бюджэтную форму навучання ў 2016 г. залічана **2202**, у 2015 г. – 2188, а ў 2014 – 2054.

На дзённае платнае навучанне прынята сёлета **1996** абітурыентаў, у 2015 – 1887, у 2014 – 1828.

Студэнтамі завочнай бюджэтнай формы навучання сталі ў 2016 г. **285** чалавек, у 2015 г. – 271, у 2014 – 286.

Платнікаў-завочнікаў – **798** чалавек, у 2015 г. іх было 704, а ў 2014 – 654.

Таксама для атрымання другой вышэйшай адукацыі залічана **228** чалавек (2015 г. – 237, 2014 г. – 263).

***Па-другое,*** узрасла колькасць пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў. Такіх абітурыентаў у БДУ **95** (у 2015 г. – 85), з іх 6 лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта РБ.

Таксама пабольшала медалістаў, якія паступілі ў БДУ. У ліку першакурснікаў кожны чацвёрты (**25,5 %**) скончыў сярэднюю школу з медалём або ўстанову сярэдняй спецыяльнай адукацыі з дыпломам з адзнакай (у 2015 г. – 23 %).




Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Уладзіслаў Раянтовіч, які здаў на 100 балаў усе тры тэсты, выбраў спецыяльнасць «інфарматыка» на ФПМІ*

***Па-трэцяе,*** захавалася тэндэнцыя высокай падрыхтаванасці абітурыентаў БДУ. З усіх прынятых на дзённую бюджэтную форму навучання больш за палову (**63 %**, у 2015 – 68 %) залічаных па агульным конкурсе маюць сумарны бал сертыфікатаў па ЦТ 300 і вышэй! Адпаведна, адбыўся і рост прахадных балаў на асобныя спецыяльнасці.

У прыватнасці, рэйтынг самых высокіх прахадных балаў дзённай формы навучання сярод прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцяў выглядае наступным чынам: «прыкладная інфарматыка (напрамак – праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм)» – 364; «інфарматыка» – 349; «актуарная матэматыка» – 338; «камп'ютарная бяспека (напрамак – матэматычныя метады і праграмныя сістэмы)» – 335; «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі (напрамак – вэб-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі)» – 328.

Самыя высокія прахадныя балы сярод сацыяльнагуманітарных і эканамічных спецыяльнасцяў: «міжнародныя адносіны» і «міжнароднае права» – 382; «лінгвакраіназнаўства» – 381; «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» – 376; «бізнес-адміністраванне» – 373.

Самыя высокія прахадныя балы сярод творчых спецыяльнасцяў: «журналістыка (напрамак – аўдыявізуальная)» – 370; «журналістыка (напрамак – вэб-журналістыка)» – 338; «журналістыка (напрамак – друкаваныя СМІ)» – 327; «журналістыка міжнародная» – 317; «журналістыка (напрамак – менеджмент сродкаў масавай інфармацыі)» – 307; «літаратурная праца» – 306; «дызайн (напрамак – камунікатыўны дызайн)» – 256; «дызайн (напрамак – прадметна-прасторавага асяроддзя)» – 249.

На завочнай бюджэтнай форме навучання самыя высокія прахадныя балы на наступных спецыяльнасцях і напрамках: «менеджмент (напрамак – міжнародны менеджмент)» – 230; «фінансы і крэдыт» – 213; «сацыялогія» – 209.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УРАЧЫСТАСЦІ

## Віват, студэнт – 2016!

Святочныя мерапрыемствы да Дня ведаў пройдуць 1 верасня ў БДУ.

Сцэнарый урачыстага дня ўключае розныя сюжэтныя дзействы: ад традыцыйнага шэсця са штандарамі факультэтаў перад строем першакурснікаў да набажэнства ў гонар пачатку новага навучальнага года ў Мінскім кафедральным Свята-Духавым саборы.

У 10.30 ва ***ўнутраным дворыку БДУ*** прагучаць віншаванні ад рэктара акадэміка Сяргея Абламейкі, дэканаў, выкладчыкаў і лідараў моладзевых арганізацый. Будуць зладжаны экскурсіі па рэктараце, навучальных карпусах і музеі гісторыі БДУ. Таксама «навабранцы» ўшануюць памяць загінулых у гады ВАВ студэнтаў і выкладчыкаў хвілінай маўчання і ўскладуць кветкі да манумента ва ўніверсітэцкім двoрыку. Акрамя таго, у гэты святочны дзень першакурснікі змогуць зладзіць дэмакратычнае новаўвядзенне нашага часу – групавое «сэлфі». Як звычайна, «фотасесія» пройдзе ў родных «дэкарацыях» на фоне гістарычнага адміністрацыйнага корпуса БДУ.

У гонар пачатку навучальнага года Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі адслужыць ***набажэнства ў Мінскім кафедральным Свята-Духавым саборы.*** Удзел у ім возьмуць кіраўнікі і выкладчыкі, а таксама студэнты БДУ. Пачатак службы ў 12.00.

Свята працягнецца ўвечары ў Палацы спорту. ***Праграма «Віват, студэнт!»*** пачнецца ў 17.00. Для першакурснікаў прадэманструюць на велізарным святлодыёдным экране асноўныя шляхі развіцця найстарэйшай ВНУ Беларусі, падзнаёмяць з адукацыйнымі магчымасцямі БДУ. Удзельнікі і госці імпрэзы стануць сведкамі суперсучаснага светлавога прадстаўлення – лазернага шоу. У гэтым навамодным сцэнічным дзействе галоўным элементам уздзеяння на гледачоў з'яўляюцца яркія мультыплікацыі, створаныя сканаваннем промня лазера на плоскай паверхні. Гэту праграму падрыхтавалі артысты тэатра Уладзіміра Кустава.

Завершыцца святочны вечар выступленнем папулярных беларускіх гуртоў і артыстаў: Дзядзька Ваня, NAVI, «Дразды», «Скай тай», трыа Lay'La і рытм-гурт «Грыг-Перкашн».

Арганізуюць мерапрыемства ўпраўленне па справах культуры і ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю БДУ.

### У нумары:

ДЗЕ ПІШУЦЦА БЕЛАРУСКІЯ ЗАКОНЫ?
Гутарка з загадчыкам кафедры канстытуцыйнага права прафесарам Рыгорам ВАСІЛЕВІЧАМ з нагоды парламенцкіх выбараў
*Стар. 2*

ПЕДАГОГІКА Ў БДУ
Інтэрв'ю з загадчыцай кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі Вольгай ЖУК пра здабыткі калектыву
*Стар. 3*

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА
Гід для новых студэнтаў па моладзевых арганізацыях, творчых калектывах, а таксама рэсурсах Фундаментальнай бібліятэкі БДУ і інш.
*Стар. 4*

### Весткі з рэктарата

**ПРАРЭКТАРАМ** па вучэбнай рабоце БДУ загадам рэктара з 22 жніўня прызначаны кандыдат гістарычных навук *Сяргей Мікалаевіч Ходзін*. Да гэтага прызначэння ён працаваў дэканам гістарычнага факультэта. Дэканам гістарычнага факультэта прызначаны доктар гістарычных навук *Аляксандр Генадзьевіч Кахаоўскі*.

* * *

**БРОНЗАВЫ** медаль на XXXI летніх Алімпіядзе ў Рыа-дэ-Жанэйра заваяваў студэнт юрыдычнага факультэта БДУ *Джавід Гамзатаў*.

Наш барэц стартаваў на Алімпіядзе з дзвюх упэўненых перамог над кітайскім і аўстрыйскім атлетамі і толькі ў паўфінале саступіў чэмпіёну свету з Украіны Жану Беленюку. У сутычцы за «бронзу» Джавід Гамзатаў адолеў балгарына Мікалая Байракава – 4:1. Выхадзец дагестанскага Куруша пераехаў у Беларусь у 2006 г. У 2013 г. ён стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату свету.

Акрамя таго, на спаборніцтвах у Бразіліі годна выступіла яшчэ адна студэнтка юрфака БДУ *Алена Амялюсік*. У шашэйнай індывідуальнай велагонцы з раздзельным стартам вядомая беларуская спартсменка заняла 11-е месца. А перад гэтым яна паказала 13-ы вынік у групавой шашэйнай гонцы на 138 км.

* * *

**ДАМОВА** аб супрацоўніцтве падпісана паміж БДУ і Універсітэтам фінансаў і эканомікі Гуансі (КНР). У кітайскай ВНУ навучаецца на поўным курсе каля 14 тысяч студэнтаў, дзейнічаюць 17 навучальных інстытутаў і падраздзяленняў. ВНУ прапануе 25 адукацыйных напрамкаў для чатырохгадовай адукацыі на ступені бакалаўра, а таксама 23 напрамкаў для навучання на працягу трох гадоў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Дзе пішуцца беларускія законы?

Напярэдадні важнай палітычнай падзеі для нашай краіны – выбараў у нацыянальны парламент – мы папрасілі растлумачыць сутнасць дадзенага мерапрыемства загадчыка кафедры канстытуцыйнага права прафесара Рыгора ВАСІЛЕВІЧА, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь, які займаў пасады Старшыні Канстытуцыйнага Суда, а таксама Генеральнага пракурора нашай краіны.



***– Рыгор Аляксеевіч, што ўяўляе сабою беларускі парламент у кантэксце міжнародных прававых сістэм?***

– Слова «парламент» утворана ад французскага parler – казаць, гэта значыць месца, дзе прадстаўнікі народа абмяркоўваюць найбольш важныя пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

Паводле арт. 90 Канстытуцыі парламентам з'яўляецца Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь – прадстаўнічы і заканадаўчы орган дзяржавы. Прадстаўнічым ён з'яўляецца таму, што абіраецца народам і з улікам пазіцыі выбаршчыкаў, выяўленай на выбарах, прадстаўляе розныя пласты насельніцтва. Парламент як прадстаўнічы орган выяўляе інтарэсы ўсіх грамадзян.

Парламент з'яўляецца двухпалатным органам. Складаецца з Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Кожная з палат валодае ўласным прадметам распараджэння, хоць некаторыя пытанні, разгляд якіх пачаты ў адной з палат, могуць быць перададзены для вырашэння ў другую палату. Найбольш характэрны прыклад – разгляд законапраектаў: прыняты ў Палаце прадстаўнікоў закон паступае для разгляду ў Савет Рэспублікі (прынята лічыць палату, дзе пачынаецца заканадаўчы працэс, ніжняй, а дзе заканчваецца – верхняй). Аднак па шэрагу пытанняў ініцыятарам першапачаткова можа быць верхняя палата – Савет Рэспублікі. Напрыклад, рэалізацыя ёю права заканадаўчай ініцыятывы (арт. 99 Канстытуцыі), ініцыяванне правядзення рэспубліканскага рэферэндуму, аналагічнае рашэнне павінна прыняць Палата прадстаўнікоў (арт. 74 Канстытуцыі).

***– Наколькі неабходны ў нашых умовах двухпалатны парламент?***

– Часам узнікаюць сумненні ў неабходнасці мець двухпалатны парламент. У гэтай сувязі адзначу, што двухпалатны парламент у большай ступені накіраваны на забеспячэнне высокага ўзроўню заканатворчай дзейнасці, бо верхняя палата выступае свайго роду органам, які правярае якасць закона. Савет Рэспублікі мае права ўхваліць ці адхіліць закон, прыняты ніжняй палатай. Яшчэ адзначу, што ў сучасных унітарных краінах з колькасцю насельніцтва каля дзесяці мільёнаў чалавек звычайна ёсць двухпалатныя парламенты. Выключэнне – Партугалія і Украіна (заўважу, што для Украіны ў сувязі з існымі праблемамі прадстаўніцтва тэрыторый якраз і было б карысна стварэнне двухпалатнага парламента). У шэрагу краін Еўропы са значна меншай колькасцю насельніцтва таксама ёсць двухпалатныя парламенты (Ірландыя, Ісландыя). Акрамя таго, заўважым, што сумарна лік парламентарыяў за кошт стварэння двухпалатнага парламента не павялічыўся. Наадварот, ён аптымальны.

Колькасны склад беларускага парламента на працягу апошніх трох дзесяцігоддзяў змяняўся: ад 485 у 1986 г., 360 у 1990 г., 260 у 1994 годзе да 174 у 1996 г. і наступныя гады. Такое колькаснае прадстаўніцтва з'яўляецца аптымальным і цалкам супастаўнае з прадстаўніцтвам грамадзян у замежных парламентах, дзе звычайна ў парламенце ад 9 да 17 дэпутатаў на адзін мільён усіх грамадзян.

***– Давайце нагадаем колькасць парламентарыяў у кожнай з палат.***

– У складзе Палаты прадстаўнікоў 110 дэпутатаў, абраных непасрэдна грамадзянамі, у складзе Савета Рэспублікі – 64 члены. Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Абранне ажыццяўляецца таемным галасаваннем на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і г. Мінска. Такім чынам, абіраецца па 8 членаў Савета Рэспублікі, а яшчэ 8 прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Заўважым, што фарміраванне парламента звычайна ажыццяўляецца шляхам прамых выбараў, аднак нярэдка прынцып выбарнасці дапаўняецца і прызначэннем часткі парламентарыяў кіраўніком дзяржавы.

***– Якія функцыі ажыццяўляе Нацыянальны сход?***

– Парламент – заканадаўчы орган. У наш час у Канстытуцыі не ўказваецца, што ён з'яўляецца «адзіным» ці «найвышэйшым» заканадаўчым органам. Гэта можна растлумачыць тым, што ў Канстытуцыі замацаваны і рэалізаваны прынцып падзелу ўлад. Акрамя парламента правам выдання заканадаўчых актаў валодае і кіраўнік дзяржавы, што ўплывае на субардынацыю актаў гэтых двух суб'ектаў улады.

Парламент закліканы ажыццяўляць тры асноўныя функцыі – заканатворчую, кантрольную і распарадчую. Іх аб'ём залежыць ад формы кіравання, актыўнасці саміх парламентарыяў, прававой і палітычнай асновы.

Рэалізуючы заканатворчую функцыю, парламент, як калегіяльны прадстаўнічы орган, прымае законы, якія павінны выяўляць волю народа. Законы, нароўні з дэкрэтамі і ўказамі, валодаюць пасля Канстытуцыі найвышэйшай юрыдычнай сілай. Пасродкам прыняцця праграмных і іншых законаў, напрыклад, пра бюджэт, удзельнічае ў кіраванні справамі дзяржавы.

Парламенцкі кантроль рэалізуецца ў формах і межах, прадугледжаных Канстытуцыяй, і валодае юрыдычнай асновай для таго, каб быць эфектыўным не толькі ў адносінах да ўрада і іншых органаў выканаўчай улады, але і ў дачыненні да мясцовых органаў самакіравання.

У адрозненне ад вышэйпаказаных функцый, якія патэнцыйна цалкам адпавядаюць заходняму ўзроўню парламенцкай дэмакратыі, распарадчая функцыя з'яўляецца самай слабай. Цікава, што да ўвядзення ў дзеянне 30 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі парламент (раней – Вярхоўны Савет) паводле арт. 97 Канстытуцыі 1978 г. меў права прыняць да свайго разгляду і вырашыць любое пытанне, якое знаходзіцца ў распараджэнні Рэспублікі Беларусь. Распарадчая функцыя, што характэрна для дзяржаў з прэзідэнцкай формай кіравання, у наш час у значнай ступені абмяжоўваецца пытаннямі ўнутранай арганізацыі палат парламента, яго ўзаемадзеяння з іншымі структурамі ўлады (пры гэтым для такога «ўзаемадзеяння» не характэрныя адносіны па прынцыпе «ўлада – падначаленне»).

***– Як часта палаты збіраюцца на сесіі?***

– Палаты збіраюцца на дзве чарговыя сесіі ў год. Першая адкрываецца 2 кастрычніка (працягласцю не больш за 80 дзён), другая – 2 красавіка (працягласцю не больш за 90 дзён). Пазачарговыя сесіі могуць быць скліканы па ініцыятыве прэзідэнта, а таксама па патрабаванні не менш як дзвюх траціх галасоў ад поўнага складу кожнай з палат па вызначаным парадку дня.

Пазачарговыя сесіі склікаюцца ўказамі прэзідэнта, чарговыя пачынаюць сваю працу «па праве», гэта значыць у пэўныя дні каляндара (2 кастрычніка ці 2 красавіка), а калі яны выпадаюць на непрацоўны дзень, то ў першы наступны працоўны дзень.

Першыя пасля выбараў сесіі палат парламента склікаюцца Цэнтральнай камісіяй па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў і пачынаюць сваю працу не пазней чым праз 30 дзён пасля выбараў.

***– Вы працяглы час працавалі ў Сакратарыяце Вярхоўнага Савета РБ, ці змяніліся з тых часоў механізмы прыняцця законаў?***

– Сапраўды, з 1986 года працаваў у Сакратарыяце Вярхоўнага Савета ў юрыдычным аддзеле, а з 1989 г. па 1994 г. узначальваў яго. Час быў складаны, але цікавы. Выбары ў лютым-сакавіку 1990 г. праходзілі на пераломе эпох. Канкурэнцыя сярод кандыдатаў была вельмі вострая. Выбаршчыкі, не кажучы ўжо пра кандыдатаў, выяўлялі велізарную актыўнасць. Працавалі дэпутаты вельмі дынамічна, шмат праектаў рыхтавалася ці істотна дапрацоўвалася ў камісіях Вярхоўнага Савета.

Юрыдычны аддзел сакратарыята быў актыўным удзельнікам заканатворчай дзейнасці. Мне, як загадчыку аддзела, даводзілася чытаць і выказваць заўвагі (прапановы) наконт усіх законаў, іншых дакументаў, якія ішлі для разгляду на сесію, за выключэннем рэдкіх выпадкаў камандзіроўкі. У цэлым была канструктыўная і цікавая праца з дэпутатамі. Толькі за чатыры гады (з 1990 па 1994) Вярхоўны Савет прыняў больш за 400 заканадаўчых актаў. Столькі ж было прынята за папярэднія пяцьдзясят гадоў мернай працы Вярхоўнага Савета папярэдніх скліканняў.

Падкрэслю, што канцэпцыю закона і, як правіла, яго змест вызначалі дэпутаты. Працавалі да позняга вечара. За адсутнасцю часу раніцай звычайна чытаў учарашнія газеты. Ды і тое для таго, каб параўнаць рэаліі з напісаным. Так працавала большасць супрацоўнікаў і парламентарыяў. Многія з іх жывуць і цяпер. Яны могуць пацвердзіць, што я распавёў самае мінімальнае, што можна сказаць пра беларускі парламент таго перыяду.

***– Ці лічыце Вы неабходным павышаць палітычную культуру нашых грамадзян, у тым ліку студэнтаў, і якія магчымыя шляхі?***

– Мне здаецца, што палітычная культура нашых грамадзян, уключаючы і студэнтаў, у цэлым на высокім узроўні. Яны шмат у чым разбіраюцца. Карысна было б праводзіць параўнанне з тым, як выбудавана палітычная сістэма за мяжой і ў нас, чым у лепшы бок яна адрозніваецца і што варта было б палепшыць. Гэтым павінны займацца не толькі навукоўцы і выкладчыкі, але і службоўцы. Шмат хто з іх не вельмі хоча выходзіць на «перадавую». А трэба! У лістападзе 2016 г. будзе дваццаць гадоў з дня правядзення рэферэндуму, на якім ішло галасаванне па карэкціроўцы некаторых артыкулаў Канстытуцыі. Вось тут многія павінны сябе праявіць!

**Гутарыла**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**




11 верасня грамадзяне краіны павінны абраць 110 дэпутатаў з болей чым 520 кандыдатаў. Сачыць за падрыхтоўкай і ходам выбарчай кампаніі вы можаце на сайце ***www.belarus.by***

Найбольшая колькасць кандыдатаў у дэпутаты зарэгістравана ў Мінску – 117 у 20 акругах.

З 18 жніўня па 9 верасня адбываюцца тэледэбаты сталічных кандыдатаў на тэлеканале «Беларусь 3».

Стандартная місія па назіранні за парламенцкімі выбарамі ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ пачала маніторынг у Беларусі ў канцы ліпеня. Ключавая каманда місіі складаецца з 10 экспертаў, якія працуюць у Мінску, і 38 доўгатэрміновых назіральнікаў у рэгіёнах. Яшчэ 400 кароткатэрміновых удзельнікаў маніторынгу прыбудуць за некалькі дзён да выбараў.

Акрамя таго, у нашу краіну прыбыла група міжнародных аглядальнікаў ад Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў–удзельніц СНД.

Згодна з рэкамендацыямі БДІПЧ АБСЕ, у парадак правядзення выбараў быў унесены шэраг працэдурных змяненняў, якія датычацца фарміравання выбарчых камісій, падліку галасоў, работы Цэнтрвыбаркама, дэтэрмінавага галасавання, правядзення агітацыйных мерапрыемстваў.

**МАЛАДЫМ ВЫБАРШЧЫКАМ**

На сайце БДУ па спасылцы www.bsu.by/ru/main.aspx?guid=249371 можна даведацца пра:

- Час працы выбарчых участкаў
- Участкі для галасавання ў г. Мінску іншагародніх студэнтаў БДУ
- Участкі для галасавання ў г. Мінску

а таксама азнаёміцца з вытрымкамі з Выбарчага кодэкса РБ

ПАДЗЕЯ

# Педагогіка ў БДУ

На працягу 90 гадоў у БДУ дзейнічае кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі. Пра яе здабыткі і ініцыятывы распавяла загадчыца, доктар педагагічных навук, прафесар Вольга ЖУК.



***– Вольга Леанідаўна, як мяняецца змест і методыкі навучання ва ўмовах хуткасных і маштабных зменаў у грамадстве?***

– Змены ў арганізацыйных формах і метадах навучання звязаны перш за ўсё з пераходам ад парадыгмы выкладання да парадыгмы вучэння, узмацненнем «студэнтацэнтрычнага» падыходу ў адукацыйным працэсе, актывізацыяй самастойнай працы студэнтаў. Як гэтага дасягнуць? Праз выкананне студэнтамі індывідуальных ці групавых праектаў, рашэнне кейсаў па актуальных праблемах, шырокае выкарыстанне дыскусійных і гульнявых методык, методык калектыўнай працы. Падчас выкладання псіхолага-педагагічных дысцыплін часта практычныя заняткі праводзяцца ў форме трэнінгаў.

Псіхолага-педагагічная адукацыя павінна быць асобасна-арыентаванай і практыка-накіраванай, павінна даваць не толькі веды, але і ўніверсальныя ўменні, неабходныя і ў прафесіі, і ў сацыяльна-асобаснай жыццядзейнасці. Таму, як правіла, навучальны працэс не заканчваецца вучэбнымі заняткамі. Напрыклад, для многіх студэнтаў арганізуецца назіральная практыка ў Ліцэі БДУ і СШ №30 г. Мінска з наведваннем і метадычным аналізам урокаў і сацыякультурных мерапрыемстваў. У рамках спецкурса па педагагічных зносінах мы праводзілі дэбаты па актуальнай праблематыцы паміж студэнтамі гістарычнага і філалагічнага факультэтаў. Студэнты юрыдычнага факультэта пасля вывучэння гэтага спецкурса ўдзельнічалі ў пасяджэнні суда, дзе назіралі за рэальным ходам судовага працэсу, але ўжо разумеючы, якія камунікатыўныя навыкі патрэбныя юрысту. Пасля вывучэння педагогікі студэнты факультэта філасофіі і сацыяльных навук распрацоўвалі і здзяйснялі навучальную экскурсію па гістарычным цэнтры Мінска. Студэнты факультэта сацыякультурных камунікацый наведвалі музей памяці Халакосту – гістарычную майстэрню, якой кіруе дацэнт гістарычнага факультэта К. І. Казак. Пасля азнаямлення з экспанатамі або сустрэч з цікавымі людзьмі студэнты працягвалі даследчы праект. Яны бралі інтэрв'ю, прыносілі матэрыялы, якія, у сваю чаргу, потым станавіліся «экспанатамі» гэтай гістарычнай майстэрні.

Важна, што авалоданне студэнтамі адпаведнымі псіхолага-педагагічнымі курсамі, распрацаванымі на кафедры, дапаможа ім не толькі ў іх прафесійным, але ў сямейным жыцці, пры ўсталяванні шчаслівых, гарманічных шлюбных адносін, арганізацыі паўнавартаснага развіцця і выхавання дзяцей.

***– Ці накіравана Ваша праца на «ўнутраны рынак» БДУ? Як сябе праяўляюць Вашы спецыялісты ў выкладанні?***

– Сярод выкладчыкаў універсітэта ёсць тыя, хто вывучаў псіхолага-педагагічныя і метадычныя дысцыпліны і мае педагагічную кваліфікацыю. У той жа час значная частка выкладчыкаў не мае спецыяльнай педагагічнай падрыхтоўкі. У 2015 годзе сумесна з упраўленнем кадраў быў рэалізаваны праект па павышэнні педагагічных кампетэнцый маладых выкладчыкаў БДУ. Большасць з іх раней не вывучалі прафесійна-арыентаваных педагагічных дысцыплін. Між тым якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ шмат у чым вызначаецца якасцю выкладання.

Сёння сучаснаму выкладчыку неабходна не толькі валодаць сваім прадметам, быць захопленым навукай, але і быць кампетэнтным у галіне псіхалогіі і педагогікі, ведаць сусветныя адукацыйныя трэнды і педагагічныя інавацыі, валодаць эфектыўнымі тэхналогіямі навучання і прыёмамі матывацыі студэнтаў і прадуктыўных зносін. Гэта значыць, што выкладчыку (незалежна ад педагагічнага стажу) варта не толькі пастаянна павышаць узровень кампетэнцый у сваёй спецыяльна-прадметнай галіне, але і ўдасканальваць псіхолага-педагагічныя кампетэнцыі. Маладыя выкладчыкі ўніверсітэта высока ацанілі арганізаваныя для іх навучальныя семінары і трэнінгі ў сферы педагогікі і педагагічнага майстэрства. Таму праект будзе працягвацца.

***– Якія яшчэ адукацыйныя праграмы рэалізуе кафедра?***

– На другой ступені вышэйшай адукацыі кафедра працуе з агульнаўніверсітэцкім патокам магістрантаў. Для іх мы выкладаем дысцыпліну «Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы». Гэта абавязковы курс, таму што магістарская падрыхтоўка – гэта не толькі паглыбленая падрыхтоўка па канкрэтнай спецыяльнасці, але і атрыманне навукова-педагагічнай кваліфікацыі, якая дазваляе ажыццяўляць прафесійную педагагічную дзейнасць. Таксама на нашай кафедры функцыянуе магістратура па спецыяльнасці «Агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі». Мы выпускаем невялікую групу магістраў у галіне педагогікі, якія працуюць у сістэме адукацыі па многіх напрамках. Акрамя таго, на кафедры рэалізуюцца праграмы пасляўніверсітэцкай адукацыі праз аспірантуру і дактарантуру. Штогод праходзяць навучанне 8–10 суіскальнікаў. За пяць апошніх гадоў супрацоўнікамі кафедры абаронены 1 доктарская і 3 кандыдацкія работы.

Выкладчыкі кафедры на высокім узроўні праводзяць даследаванні ў галіне педагогікі і адукацыі. З 2010 па 2015 гады мы выканалі 5 фінансаваных навуковых праектаў па забеспячэнні дзейнасці Міністэрства адукацыі, а таксама 2 міжнародныя праекты. Гэта розныя па сваёй праблематыцы практыка-арыентаваныя праекты, усе яны актуальныя і былі ўкаранёныя.

***– Ці задзейнічана кафедра ў міжнародных праектах?***

– Мы рэалізавалі за 2011–2015 гг. два навуковыя праекты пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў і Расійскага гуманітарнага навуковага фонду. Гэтыя праекты звязаныя з распрацоўкай праблем інклюзіўнай адукацыі і падрыхтоўкай педагогаў для працы ў безбар'ерным асяроддзі, для працы з дзецьмі з асаблівасцямі развіцця.

Акрамя таго, на кафедры ажыццяўляецца міжнародны праект у рамках дамовы аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Сафійскім універсітэтам імя Клімента Ахрыдскага. На працягу апошніх 5 гадоў у яго рамках на базе балгарскага ўніверсітэта пастаянна праводзіліся сумесныя семінары і канферэнцыі. У выніку выдадзены манаграфія, дапаможнікі па прэвентыўнай педагогіцы і іншых педагагічных праблемах.

***– За столькі гадоў працы ці сфарміраваліся на кафедры нейкія традыцыі, не звязаныя непасрэдна з працоўнай дзейнасцю, якія-небудзь грамадскія або асабістыя ініцыятывы?***

– У свой час на кафедры працавала шмат ветэранаў ВАВ, многія з якіх, на жаль, ужо пайшлі з жыцця. Але пры іх жыцці склалася традыцыя: 9 мая – быў асаблівы дзень. Мы заўсёды віншавалі ветэранаў, ладзілі творчыя сустрэчы для іх. Гэта была адна з самых галоўных традыцый нашай кафедры, якую мы стараемся падтрымліваць, час ад часу сустракаючыся з ветэранамі працы…

Што да грамадскіх ініцыятыў. Я была ініцыятарам і навуковым кіраўніком праекта «Студэнцкая сям'я – XXI стагоддзе», які рэалізоўваўся ў 2000–2008 гг. у БДУ сумесна з Саюзам жанчын БДУ і ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю. Штогод удзельнічалі да 30 студэнцкіх сем'яў або пар, якія рыхтаваліся да шлюбнага жыцця. Праект быў накіраваны на авалоданне студэнцкай моладдзю асновамі рэпрадуктыўнага здароўя, здаровага ладу жыцця, планавання сям'і, паўнавартаснага развіцця і выхавання дзяцей у сям'і, канструктыўных міжасобасных зносін і эфектыўнага вырашэння канфліктаў. Ён ажыццяўляўся праз семінары, сустрэчы-гутаркі са спецыялістамі, трэнінгі, круглыя сталы, фестывалі-святы. Па водгуках студэнтаў, праект быў цікавым і запатрабаваным сярод моладзі.

У сённяшні час праблемы сям'і, сямейнага выхавання, шчаслівага шлюбу ўключаны ў навучальныя праграмы дысцыпліны «Асновы псіхалогіі і педагогікі», спецкурс «Педагогіка сям'і», «Паўнавартаснае развіццё дзіцяці ў сям'і», якія распрацаваны і рэалізуюцца кафедрай.

Пад кіраўніцтвам дацэнта нашай кафедры А. Р. Давыдоўскага працуе дыскусійны інтэлектуальны студэнцкі клуб «Людзі з будучыні» на базе біялагічнага факультэта. Тэматыку пасяджэнняў вызначае само жыццё: «Чалавек супраць сябе: педагагічныя аспекты чалавечай дэструктыўнасці», «Катастрофы асобы: педагагічныя аспекты псіхалагічных крызісаў і страты сэнсу жыцця сучаснага чалавека» і інш. Плануецца дзейнасць клуба працягнуць. Запрашаем усіх ахвотных.

**Гутарыў
Сяргей МАЕЎСКІ**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**04 верасня Карпушэнкава Ларыса Сцяпанаўна,** дацэнт кафедры фізічнай хіміі

**08 верасня Петачэнка Тамара Міхайлаўна,** дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права

**09 верасня Саўчук Уладзімір Пятровіч,** дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі

**10 верасня Ярмалінскі Валянцін Іванавіч,** дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту

**12 верасня Юдзенкава Наталля Міхайлаўна,** старшы выкладчык кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі

**13 верасня Шчасная Ірына Іосіфаўна,** дацэнт кафедры геаграфічнай экалогіі

**20 верасня Бурко Леанід Дзмітрыевіч,** дацэнт кафедры заалогіі

**22 верасня Кірвель Вольга Чаславаўна,** дацэнт кафедры міжнародных адносін

**24 верасня Зуеў Мікалай Міхайлавіч,** дацэнт кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі

**24 верасня Абламейка Сяргей Уладзіміравіч,** рэктар

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, вышэйшай алгебры і аховы інфармацыі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, філасофіі і метадалогіі навукі, замежнай літаратуры, славянскіх літаратур, сучаснай беларускай мовы, нямецкай мовы,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: камп'ютарных тэхналогій і сістэм, метадаў аптымальнага кіравання, батанікі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, міжнароднага менеджменту, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, аналітычнай хіміі, высокамалекулярных злучэнняў, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, біяхіміі, генетыкі, клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, крыніцазнаўства, літаратурна-мастацкай крытыкі, медыялогіі і вэб-журналістыкі, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, міжнароднага менеджменту, філасофіі культуры, гісторыі беларускай мовы, класічнай філалогіі, сучаснай беларускай мовы, дзяржаўнага кіравання, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: генетыкі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, псіхалогіі, нямецкага мовазнаўства, раманскага мовазнаўства, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, раманскіх моў, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, дызайну, фізічнага выхавання і спорту,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: дызайну, фізічнага выхавання і спорту,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: батанікі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**«РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ»**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ праектавання адукацыйных сістэм;
ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ кіравання і эканомікі вышэйшай школы;
ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ праектавання адукацыйных сістэм;
ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ сучаснага прыродазнаўства;
СТ. ВЫКЛАДЧЫКА кафедры моладзевай палітыкі і сацыякультурных камунікацый.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, пакой 219, тэл. 200 91 07.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ кіравання маёмасцю;
ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ кіравання маёмасцю.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Прыёмная кампанія ў БДУ** – Tut.by (02.07), БелТА (04.07), sputnik.by (05.07), БТ-1, АНТ (06.07), sb.by (08.07), interfax.by (09.06), zn.sb.by (13.07), minsknews.by (14.07), telegraf.by (16.07), zviazda.by (21.07), «Рэспубліка» (23.07), БелТА, sputnik.by, minsknews.by (04.08), sb.by (05.08).

**Міжнародная летняя школа беларусістыкі прайшла ў БДУ** – wuz.by, soyuz.by (27.06), БелТА (28.06), БелаПАН, СТБ (07.07).

**Студэнты БДУ запусцілі спадарожнік на чэмпіянаце «Cansat у Расіі»** – megacat.by, СТБ, БТ-1 (18.07), zviazda.by, «Звязда» (21.07), «Настаўніцкая газета» (28.07).

**Ліцэісты БДУ Раман Ларковіч і Рыгор Сіненка заваявалі «серабро» на 47-й Міжнароднай хімічнай алімпіядзе (IChO 2016)** – Tut.by, edu.gov.by, dal.by, 21.by (01.08), vileyka-online.by, БелТА, soyuz.by (02.08), zviazda.by, БТ-1 (03.08), wuz.by (04.08), «Настаўніцкая газета» (06.08), nastgaz.by (08.08).

**Студэнт юрыдычнага факультэта БДУ Джавід Гамзатаў заваяваў бронзавы медаль на XXXI летняй Алімпіядзе ў Рыа-дэ-Жанэйра** – mail.ru, noc.by, kp.by, БелТА, nashkraj.by, БелаПАН, naviny.by, sputnik.by, СТБ, 5min.by, 21.by (15.08), Tut.by, tkm.by, mvradio.by, minsknews.by, sb.by, citydog.by, belnovosti.by, slova.by, БТ-1, newsgomel.by, ryb.ru, АНТ, pressball.by, telegraf.by, Edu.gov.by, mst.by (16.08), «СБ-Савецкая Беларусь», «Мінскі кур'ер» (17.08), «Звязда», zviazda.by, «Рэспубліка» (18.08).

**Першакурснікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Міхаіл Наталевіч і Ілья Мядзянікаў заваявалі сярэбраны і бронзавы медалі 28-й Міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы** – soyuz.by, interfax.by, Tut.by, sputnik.by, БелТА, edu.gov.by, sb.by, n1.by, ej.by, АНТ, belnovosti.by, gp.by (19.08), zviazda.by, «Звязда» (20.08), БТ-1 (24.08), «Настаўніцкая газета» (25.08).

**«Гарачая лінія» па пытаннях засялення ў інтэрнаты для навучэнцаў працуе ў БДУ** – ecopress.by, minsknews.by (16.08), megacat.by (17.08), АНТ (25.08), Мінск-ТБ (25.08).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

*Учарашнія школьнікі сталі студэнтамі. Іншае жыццё, іншыя правілы. Каб вы не згубіліся ў плыні новай інфармацыі, прапануем вам у дапамогу своеасаблівы компас па ўніверсітэце і яго структурах – «Школу першакурсніка». З пытаннямі, якія вас цікавяць, звяртайцеся ў рэдакцыю газеты, і мы будзем рады вам дапамагчы.*

## ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ

**«КРЫЖАЧОК» – ансамбль танца, заслужаны аматарскі калектыў РБ**

Заснаваны ў 1945 г. Рэпертуар – беларускія народныя танцы і танцы народаў свету (рускія, украінскія, польскія, яўрэйскія і іншыя). Уладальнік шматлікіх узнагарод розных фестываляў і конкурсаў Беларусі і замежжа. За час існавання калектыў прадстаўляў беларускую культуру больш чым у 50 краінах свету.

**«НЕРУШ» – фальклорна-этнаграфічны ансамбль, заслужаны аматарскі калектыў РБ**

Заснаваны ў 1980 г. Збірае нацыянальную музыку, песні, абрады і звычаі ў фальклорных экспедыцыях па Беларусі. За час існавання калектыў прадстаўляў беларускую культуру ў шматлікіх краінах.

**НАРОДНЫ АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ**

Заснаваны ў 1946 г. У рэпертуары: пераклады класічнай музыкі, апрацоўкі беларускіх і рускіх народных песень, песні народаў свету, старажытныя рамансы, творы беларускіх кампазітараў. У 2011 г. аркестр стаў лаўрэатам IV Міжнароднага фестывалю-конкурсу LIBERTANGO імя А. П'яцолы.

**НАРОДНАЯ СТУДЭНЦКАЯ ХАРАВАЯ КАПЭЛА**

Калектыў заснаваны ў 1946 г. У рэпертуары музыка розных перыядаў: старажытная беларуская, руская і заходняя музыка, музыка Сярэдніх вякоў, XIX стагоддзя і сучасная.

